Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці
прадстаўляе дакументальны праект

# АРЛЯНЯТЫ

**Выстава прымеркавана да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Экспазіцыя прадстаўлена матэрыяламі з калекцыі дакументаў з успамінамі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і тэкстамі артыкулаў пра юных патрыётаў Віцебшчыны, апублікаваных у газеце «Віцебскі рабочы» ў 1987 годзе**

# Лёня Багданаў



Арляняты

Леонид ~~Лёня~~ Богданов

## СЫН ПАЛКА

Да вайны вялікая сям'я сціплага бухгалтара Аляксандра Багданава пражывала ў вёсцы Шубкі Сенненскага раёна. У першыя ж дні Вялікай Айчыннай бацьку мабілізавалі ў Чырвоную Армію, а ў Шубках неўзабаве паявіліся гітлераўцы і пачалі ўстанаўліваць свой «новы парадак». Нямала жудасных карцін нечалавечага абыходжання акупантаў з савецкімі людзьмі давялося ўбачыць адзінаццацігадовому Лёню Багданаву. Сэрца хлапчука гарэла нянавісцю да фашыстаў. Калі ў 1942 годзе ў Сенненскім раёне паявіліся партызаны, якія неаднаразова заходзілі на начлег да Багданавых, ім дапамагаў, чым мог, і Лёня.

У час карнай аперацыі гітлераўцаў вясной 1944 года многія мірныя жыхары, у тым ліку і Багданавы, пайшлі пад ахову народных мсціўцаў у партызанскую зону. Пад націскам пераўзыходзячых сіл праціўніка партызаны Сенненшчыны вымушаны былі адыходзіць у лепельскія лясы. Так Лёня Багданаў апынуўся ў вёсцы Кавалевічы Лепельскага раёна і знаходзіўся тут да прыходу Чырвонай Арміі.

У чэрвені 1944 года трынаццацігадовы Лёня быў залічаны сынам 781-га артылерыйскага палка 215-й Уральскай стралковай дывізіі. У баявой часці Лёню навучылі рамантаваць палявыя радыёстанцыі, і гэту работу яму даводзілася выконваць пад агнём праціўніка прама ў траншэях.

Разам са сваімі старэйшымі баявымі сябрамі-бамбардзірамі Лёня прайшоў з баямі праз родную Беларусь, братнюю Літву, дайшоў да граніцы фашысцкай Прусіі. І тут ён атрымаў паведамленне аб тым, што яго маці яшчэ ў 1943 годзе расстралялі карнікі.

Няцяжка зразумець, якой лютай нянавісцю да заклятага ворага закіпела сэрца юнага піянера-воіна. За смерць маці, за загінуўшых баявых сяброў-аднапалчан, за гора і слёзы, якія прынеслі савецкім людзям гітлераўскія захопнікі, з дазволу камандзіраў Лёня першым у палку выпусціў з гарматы беглым агнём серыю снарадаў па фашысцкіх умацаваннях.

Леанід Багданаў успамінае: «Прымалі мяне ў члены ВЛКСМ зімой 1944 года, прама на перадавой, у зямлянцы побач з траншэямі і хадамі злучэнняў... Словам, ішоў на камсамольскі сход піянерам, а выйшаў ужо камсамольцам. Быццам на цэлую галаву вышэй ростам стаў і больш дарослым».

Ужо камсамольцам Леанід Багданаў са сваім палком удзельнічаў ва ўзяцці многіх населеных пунктаў Усходняй Прусіі і дайшоў да Балтыйскага мора. За храбрасць і мужнасць, праяўленыя ў баях з фашысцкімі захопнікамі, узнагароджан медалем «За адвагу».

Аднак з разгромам гітлераўскай Германіі вайна для Леаніда не скончылася. Сын палка ў саставе свайго злучэння яшчэ прайшоў па сопках Маньчжурыі, прымаў удзел у выгнанні японскіх самураяў з многіх гарадоў. Гімнасцёрку юнага воіна ўпрыгожыў яшчэ адзін медаль — «За баявыя заслугі».

Наспеўшы да вайны скончыць толькі чатыры класы, Леанід Аляксандравіч Багданаў пасля баявых паходаў працягваў вучобу ў рамесным вучылішчы, вячэрняй сярэдняй школе, а ў 1973 годзе скончыў завочна палітэхнікум.

Цяпер камуніст Л. А. Багданаў жыве ў горадзе-герої Мінску, працуе на маторным заводзе. За высокія вытворчыя паказчыкі ў восьмай пяцігодцы ён узнагароджан ордэнам Леніна, а ў 1974 годзе яму прысвоена званне «Заслужаны работнік прамысловасці БССР».

**Леанід Багданаў** ва ўзросце 13 гадоў (1944) залічаны сынам 781-га артылерыйскага палка 215-й Уральскай стралковай дывізіі. У баявой частцы рамантаваў палявыя радыёстанцыі. Прайшоў са старэйшымі баявымі таварышамі праз Беларусь, Літву, удзельнічаў ва ўзяцці многіх населеных пунктаў Усходняй Прусіі, дайшоў да Балтыйскага мора. Член ВЛКСМ (1944). За адвагу і мужнасць, праяўленыя ў баях узнагароджаны медалём «За адвагу».

З разгромам гітлераўскай Германіі прайшоў у складзе свайго злучэння па сопках Манчжурыі, удзельнічаючы ў выгнанні японскіх акупантаў, за што быў узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

ДАВц. Ф.9742-п. Воп.6. Спр.45. Арк.78.

# Коля Гайдаў

Коля Гайдов

## У КАЛЬЦЫ БЛАКАДЫ

Дзіцячыя гады Колі Гайда-а лёгкімі не назавеш. У вась-іігадовым узросце ён застаў-я без маці. У час летніх ка-ікул яму не было часу зай-мацца дзіцячымі забавамі, а аводзілася дапамагаць бацьку па гаспадарцы. У 1941 го-зе Коля скончыў пяць класаў ураўлянскай школы на По-аччыне. На гэтым яго дзя-інства, як і многіх равеснікаў, кончылася, бо на нашу зямлю варваліся фашысцкія полчы-ічы.

Юны піянер, выхаваны ў школе і сям'і ў духу нянавісці а фашызму, рашыў уключыц-а ў барацьбу з заклятым во-агам. Разам з сябрамі ён біраў зброю, узрыўчатку. Усё эта надзейна хавалі ў тайні-ах. Аднойчы яны змайстра-алі з формы для выпечкі леба самаробную міну, пакла-і яе пад мост у вёсцы Глы-бокае, які неўзабаве ўзляцеў у паветра. Гэта быў першы пос-ех юных мсціўцаў у барацьбе з фашысцкімі захопнікамі.

У 1943 годзе ў жыцці Колі здарылася трагедыя: у ліку многіх савецкіх патрыётаў ня-мецкія карнікі схапілі яго бацьку і расстралялі. Коля не разгубіўся, пайшоў у парты-занскую зону і з мая 1943 го-да стаў партызанам-разведчы-кам брыгады імя Чапаева. Спачатку дапамагаў старэй-шым баявым таварышам да-глядаць коней, адначасова вы-вучаў партызанскую зброю і спосабы яе прымянення.

Мікалай Гайдаў з пачуццём вялікай удзячнасці ўспамінае сваю дружбу з памочнікам камісара брыгады Клачковым,



які неаднаразова браў яго з сабой у час выездаў у партызанскія атрады.

Вясной 1944 года пачаліся няспынныя і жорсткія баі народных мсціўцаў з гітлераўцамі, якія заціснулі многія партызанскія злучэнні ў смяротныя ціскі блакады. І Коля разам з дарослымі мужна пераносіў усе цяжкасці і нягоды блакаднага жыцця, удзельнічаў у адкрытых баях з узброенымі да зубоў фашыстамі, быў лёгка ранены, але ніколі не баяўся і не скардзіўся на цяжкасці.

Абставіны склаліся так, што пасля выхаду з блакаднага кальца Коля апынуўся ў зоне дзеянняў 4-й Беларускай партызанскай брыгады. А баявая абстаноўка патрабавала тэрміновага правядзення разведкі аднаго з нямецкіх гарнізонаў. Партызанскі камандзір В. А Сазыкін спыніў свой выба[р] на Колі Гайдаве. Пад выгля[дам] дам вясковага хлапчука Кол[я] быў накіраваны ў вёску, [у] якой знаходзілася шмат нем[цаў] цаў і паліцаяў. Ён пранік [у] стан ворага, за нямецкія мар[кі], якімі яго забяспечылі пар[тызаны], купіў у вёсцы махор[кі] і шчасліва вярнуўся ў раз[ме]шчэнне партызан. За ча[с] знаходжання ў варожым гар[нізоне] Коля ўстанавіў коль[касць] фашысцкіх салдат і па[ліцэй]скіх, разведаў размя[шчэнне] пастоў і агнявых кро[пак] праціўніка.

З улікам гэтых звестак, са[браных] юным разведчыкам камандаванне партызан рас[працавала], а затым паспяхов[а] і без страт ажыццявіла раз[гром] варожага гарнізона.

У чэрвені 1944 года парты[заны] злучыліся з часцямі Чыр[вонай] Арміі, і Коля быў улад[каваны] ў Пастаўскі дзіцяч[ы дом], а ў 1946 годзе яго залічы[лі] юнгай на Балтыйскі фло[т]. Гэта было велізарным шчасце[м] для Колі. Нарэшце збылася яг[о] самая запаветная мара — стаць мараком. У 1952 годзе пасля заканчэння вучылішча Мікалаю Гайдаву было пры[своена] званне ваенна-марског[а] афіцэра. У 1969 годзе ён скон[чыў] інстытут інжынераў вод[нага] транспарту.

За баявыя заслугі і безда[корную] службу ва Узброены[х] Сілах камуніст Мікалай Сярге[евіч] Гайдаў узнагароджа[ны] пяццю медалямі. Цяпер ён жы[ве] ў г. Днепрапятроўску.

Сваю барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі **Коля Гайдаў** пачаў з падрыву моста самаробнай мінай у вёсцы Глыбокае. З мая 1943 года стаў партызанам-разведчыкам брыгады імя Чапаева. Аднначасова вывучаў партызанскую зброю і спосабы яе прымянення. Увесну 1944 года Коля разам з дарослымі ўдзельнічаў у адкрытых баях і мужна пераносіў нягоды блакаднага жыцця. Удзельнічаў у правядзенні разведкі аднаго з нямецкіх гарнізонаў, што дазволіла партызанам распрацаваць і ажыццявіць разгром агнявых кропак праціўніка. У 1946 годзе быў залічаны юнгай на Балтыйскі флот. У 1952 годзе Мікалаю было прысвоена званне ваенна-марскога афіцэра. За баявыя заслугі і бездакорную службу ва Узброеных Сілах узнагароджаны пяццю медалямі.

ДАВц. Ф.9742-п. Воп.6. Спр.45. Арк.78.



# Арляняты

## ПРЫКРЫВАЮЧЫ БАЯВЫХ СЯБРОЎ

У пачатку Вялікай Айчы-
й вайны сям'я дырэктара
явонаўскай школы Шумілін-
ага раёна Сяргея Іванавіча
укарава жыла ў школьным
мяшканні. Старэйшы сын
ўген, які пайшоў у армію
ичэ ў 1940 годзе, ваяваў на
онце. Разам з бацькамі бы-
трое дзяцей: Ніна і Ана-
ль — камсамольцы, Юра —
янер, 1928 года нараджэння.

Неўзабаве ў вёсцы Лявона-
размясціўся варожы гарні-
н, памяшканне школы занялі
леравцы. За сям'ёй былога
рэктара школы яны па-
янна сачылі. Так доўга пра-
гваць не магло. Выйсце бы-
адно: браць у рукі зброю і
явацы з ненавіснымі акупан-
мі.

Усе члены сям'і Букаравых
алі партызанамі атрада імя
рашылава брыгады імя У. І.
ніна.

Дзеці Ніна, Анатоль і Юра
лі залічаны ва ўзвод развед-
Бясмежна адданыя Радзі-
добра ведаючыя мясцо-
сць, кожную сцежку, а так-
а мясцовае насельніцтва,
ы паспяхова вялі разведку
многіх гарнізонах ворага,
ста пранікаючы туды, куды
рослыя не мелі ніякага до-
упу.

Трынаццацігадовы Юра не
ставаў ад старэйшых: ён ха-
ў у разведку на станцыю
аль, у Улу, у вёскі Крупіна,
рдон, Лявонава, Гараны. А
і патрабавала баявое ста-
вішча, прымаў удзел у баях,
обра змагаўся з карнікамі.

Аднойчы гітлераўцы насту-
лі з Полацка на партызан-
атрад, які размяшчаўся ў
цы Гарадзішча. Народны
іўцам прыйшлося пера-
аўляцца цераз Заходнюю
Дзвіну. Для прыкрыцця атрада
з кулямётам быў пакінуты
Юра, які паспяхова адбіваў
атакі гітлераўцаў і даў магчы-
масць атраду адысці.

У снежні 1942 года сям'я
Букаравых панесла цяжкую
страту. Пры разгроме варожа-
га гарнізона ў вёсцы Залессе
Полацкага раёна загінуў Ана-
толь Букараў. Цяжка паране-
ны, з перабітымі нагамі, Толя
страляў да апошняга патрона.

Уносячы свае скромныя збе-
ражэнні ў фонд абароны, С. І.
Букараў сказаў: «Фашысты
пазбавілі мяне прытулку, ра-
боты, па-зверску забілі майго
сына Анатоля, які быў ранен
у баі. Але я яшчэ маю дастат-
кова сіл, каб адпомсціць пра-
клятым вылюдкам за смерць
свайго любімага Толі, за здзе-
кі над нашым народам. Бу
помсціць гітлераўцам са збр
яй у руках да апошняга д
хання».

І сям'я Букаравых праца
вала бясстрашна біць ворага
У лютым 1943 года — нов
бяда. У баі загінуў сам Сярг
Іванавіч. У атрадзе засталі
Ніна і Юра.

Пасля смерці брата і баць
Юра стаў яшчэ больш бяз
тасна біць ворага. Ён ішоў
любыя заданні і выконваў
з гонарам. Быў удзельніка
аперацыі «Прарыў» на Ушач
кім раёне ў 1944 годзе, а та
сама многіх іншых.

Пасля вайны Юра скончы
Беларускі політэхнічны інсты
тут і паехаў працаваць н
«Куйбышаўгідрабуд». На бу
даўніцтве гідрастанцыі ён бы
важаком моладзі, працаваў
тэхнічнай інспекцыі, а ў апош
нія гады — старшым інжыне
рам вытворчага аддзела ўпраў
лення «Куйбышаўгідрабуд»
намеснікам старшыні камітэт
народнага кантролю будоўлі.

Радзіма высока ацаніла рат
ныя і працоўныя подзвігі ка
муніста Юрыя Сяргеевіча Бу
карава, узнагародзіўшы яго
ордэнам Чырвонай Зоркі, мно
гімі медалямі.

Вайна падарвала здароўе
Юрыя Сяргеевіча. 3 лютага
1978 года ён раптоўна памёр.
Пахаваны з воінскімі ўшана-
ваннямі.

У раённым цэнтры Глыбо-
кае жыве Н. С. Букарава-Ко-
нюхава, адзіная з гераічнай
сям'і Букаравых, якая заста-
лася ў жывых. Яна клапатліва
захоўвае сямейныя баявыя рэ-
ліквіі.

# Юра Букараў

**Юра Букараў** нарадзіўся ў сям'і дырэктара Лявонаўскай школы Шумілінскага раёна Сяргея Іванавіча Букарава. Пасля размяшчэння ў вёсцы Лявонава варожага гарнізона ўсе члены сям'і сталі партызанамі атрада імя Варашылава брыгады імя Леніна. Юра разам з братам і сястрой быў залічаны ва ўзвод разведкі. З'яўляўся удзельнікам аперацыі «Прарыў» ва Ушацкім раёне ў 1944 г. Узнагароджаны медалямі і ордэнам Чырвонай Зоркі.

ДАВц. Ф.9742-п. Воп.6. Спр.45. Арк.79.

# Лена Хляханава



## АДВАЖНАЯ «ЛАСТАЎКА»

Сям'я Хляханавых жыла ў вёсцы Лямніца былога Суражскага раёна. Калі ў 1937 годзе памёр бацька, на плечы маці ляглі ўсе клопаты аб выхаванні семярых дзяцей.

У 1941 годзе Лена Хляханава скончыла шэсць класаў. І раптам — вайна. Гора і слёзы прынесла яна савецкім людзям. Гітлераўцы развешалі загады аб пакаранні тых, хто будзе хаваць савецкіх ваеннапалонных. Але дзеці Хляханавых, выхаваныя школай, камсамолам і піянерскай арганізацыяй, сталі актыўна дапамагаць байцам Чырвонай Арміі, якія трапілі ў акружэнне. Яны выратавалі раненага камандзіра Чырвонай Арміі. Пасля ра бяты пачалі збіраць зброю, прадукты харчавання і адзенне для чырвонаармейцаў-акружэнцаў, распаўсюджваць лістоўкі.

Першы па-сапраўднаму баявы ўчынак піянерка Лена здзейсніла, калі паведаміла ў партызанскі атрад аб тым, што рыхтуецца карная экспедыцыя гітлераўцаў на партызан. Некалькі пазней па рэкамендацыі былога настаўніка Т. Е. Керасёва Лена стала агентурнай разведчыцай партызанскага атрада Гурко Першай Беларускай партызанскай брыгады. Яна прыняла прысягу на вернасць Радзіме ў штабе партызанскага атрада. Як агентурная разведчыца Лена дзейнічала пад мянушкай «Ластаўка».

У канцы студзеня 1943 года перасталі паступаць звесткі ад сувязнога з ільнозавода. Лене было даручана пайсці да яго на сустрэчу. Ёй удалося атрымаць ад сувязнога патрэбныя звесткі.

Партызанам стала вядома, што ў гітлераўскіх ваенных фарміраваннях служаць людзі, якія паддаліся фашысцкай агітацыі. З імі неабходна было правесці растлумачальную работу. У гэтай складанай аперацыі прымала ўдзел і Лена. Яна пад дыктоўку старэйшых пісала да іх зварот партызан. Для пераканаўчасці да звароту былі прыкладзены савецкія лістоўкі і зводкі аб становішчы на фронце. Гэты зварот Лена павінна была перадаць сувязной Е. П. Піскуновай.

Аб прыходзе Лены ў вёску ведала толькі сувязная. І якое ж было здзіўленне дзяўчынкі, калі ў вёсцы Слабада, куды яна прыйшла з заданнем, з-за вугла хлява выбег чалавек з аўтаматам. Гэта была засада. Што рабіць? У Лены ў рукаве паліто быў скрутак са зваротам і лістоўкамі. Лена стала адыходзіць у бок лесу. Па ёй пачалі страляць. Дзяўчынцы нічога не заставалася, як выкінуць у снег свой небяспечны скрутак. Яна падбегла да крайняй хаты, але адтуль ужо выбеглі акупанты. Яны схапілі Лену. У хаце яе абшукалі, а потым павезлі ў вёску Краўцова, дзе быў фашысцкі гарнізон. Пачаліся допыты. Немцаў цікавіла пытанне: чаго яна ішла ў вёску Слабада? Лена маўчала. Тады ёй сталі гаварыць, што партызаны здаліся немцам, што ўжо арыштаваны ўсе камандзіры.

Юная патрыётка не выдала сваіх таварышаў. Хоць такая вытрымка ёй далася нялёгка.

Як стала вядома пазней, зварот партызан і лістоўкі трапілі ў рукі тых, каму прызначаліся.

Лена яшчэ доўга заставалася пад арыштам. Вярнуцца да сваіх ёй дапамог адзін добры чалавек з аховы. Калі дзяўчынцы дазволілі выходзіць на двор, яна аднойчы ўбачыла запрэжаную падводу. Чалавек, які назваў сябе Іванам, сказаў ёй залезці пад сена... Так Лене ўдалося ўцячы з фашысцкай турмы.

Вясной 1943 года Лену зноў арыштавалі і адвезлі ў Пяты полк у Віцебск. Выбрацца адсюль Лене дапамаглі яе сваякі.

Летам 1943 года ўсю сям'ю Хляханавых, у тым ліку і Лену, зноў арыштавалі за сувязь з партызанамі. Выратавала тое, што начальнік паліцыі стаў прасіць Лену звязаць яго з партызанамі. Лена сказала, што, знаходзячыся пад арыштам, яна не можа ведаць, дзе партызаны. Тады начальнік паліцыі адпусціў усю сям'ю і дамовіўся з Ленай, што пад выглядам допыту будзе прыязджаць да іх дамоў. Лене ўдалося звязацца з партызанамі і перадаць просьбу начальніка паліцыі. Такая сустрэча адбылася ў доме Хляханавых. Партызаны пачалі даваць заданні начальніку паліцыі. Праз Лену ён перадаваў партызанам вельмі каштоўныя звесткі.

Так у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі гартаваўся характар піянеркі-патрыёткі Лены Хляханавай.

У цяперашні час Алена Архіпаўна Сокалава (Хляханава) жыве ў сваёй роднай вёсцы Лямніца, працуе ў калгасе імя Леніна.

У 1941 годзе **Лена Хляханава** скончыла шэсць класаў школы, як нечакана пачалася вайна. Выхаваная школай, камсамолам і піянерскай арганізацыяй, дзяўчынка стала актыўна дапамагаць байцам Чырвонай Арміі, якія трапілі ў акружэнне, збіраючы ежу і вопратку для салдат, распаўсюджваючы ўлёткі. Першым баявым учынкам Лены стала папярэджанне партызанскага атрада аб падрыхтоўцы карнай экспедыцыі ворага на партызан. Пазней стала агентурнай разведчыцай пад імем «Ластаўка» партызанскага атрада Гурко 1-й Беларускай партызанскай брыгады.

ДАВц. Ф.9742-п. Воп.6. Спр.45. Арк.78.

# Пеця Ярыноўскі

## Хадзіў хлапчук у разведку



Нарадзіўся Пеця Ярыноўскі ў 1929 годзе ў вёсцы Міколенкі на Асвейшчыне. Да Вялікай Айчыннай паспеў скончыць толькі 4 класы Карніцкай школы. А ў ліпені 1941 года яго родная вёска была акупіравана гітлераўцамі.

З прыходам акупантаў скончылася і Пецева дзяцінства. Ён насіў да вайны чырвоны гальштук, таму не мог заставацца ў баку ад усенароднай барацьбы з фашысцкімі захопнікамі. Перш-наперш на месцах былых баёў воінаў нашай арміі з гітлераўцамі Пеця сабраў і старанна прыхаваў нямала зброі і боепрыпасаў. Неўзабаве ўсё гэта вельмі спатрэбілася. У лясах каля яго вёскі паявіліся партызанскія групы. Некаторыя партызаны заходзілі да іх у хату і нярэдка заставаліся начаваць. Так Пеця ўпершыню пазнаёміўся з народнымі мсціўцамі. Ён перадаў ім 10 вінтовак, шмат гранат і патронаў, 4 скрынкі ўзрыўчаткі і мінамёт.

У кастрычніку 1942 года баявы і кемлівы хлопчык Пеця Ярыноўскі стаў партызанам атрада імя Катоўскага брыгады імя Фрунзе. Знаходзіўся ў радах народных мсціўцаў да ліпеня 1944 года.

У баявой характарыстыцы Пятра Іванавіча, падпісанай камандзірам партызанскага атрада А. А. Шамалем, гаворыцца вельмі коратка: хадзіў у разведку ў Бігосава, вёскі Посава і Опытная.

А было гэта так.

Зімой 1943 года партызанам было цяжка з прадуктамі харчавання.

Камандаванне атрада меркавала, што на млыне ў Посаве, які працаваў на акупантаў на тэрыторыі Латвіі, павінны быць запасы мукі. У разведку паслалі Пецю. Гэта заданне, поўнае рызыкі і небяспекі, адважны піянер выканаў з гонарам. Ведаючы сілы і сістэму абароны, партызаны без страт знішчылі ахову млына і забралі ўсе запасы мукі.

Не менш рызыкоўныя і адказныя заданні выконваў Пеця і па збору разведвальных даных, пранікаючы ў Бігосава і вёску Опытная.

Цяпер Пётр Іванавіч Ярыноўскі жыве ў Віцебску, працуе токарам на адным з прадпрыемстваў горада, сустракаецца з моладдзю і расказвае аб гераічнай барацьбе народных мсціўцаў з гітлераўскімі захопнікамі.

Да моманту, калі **Пеця Ярыноўскі** паспеў скончыць 4 класы Карніцкай школы на Асвейшчыне, яго родная вёска Міколенкі была акупаваная гітлераўцамі. На месцах былых баёў Пеця сабраў і прыхаваў нямала зброі і боепрыпасаў. Пазней свае знаходкі ён перадаў народным мсціўцам, якія з'явіліся ў лясах недалёка ад вёскі. У 1942 годзе баявы і кемлівы хлапчук стаў юным партызанам атрада імя Катоўскага брыгады імя Фрунзе. Хадзіў у разведку ў Бігосава, вёскі Посава і Опытная.

ДАВц. Ф.9742-п. Воп.6. Спр.45. Арк.80.

# Толя Карнееў

Анатолий Корнеев

## Зноў у тыл праціўніка

Да вайны дзесяцігадовы Толя Карнееў часта паяўляўся ў ціры. Там і навучыўся страляць з пісталета.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны хлопчыка напаткала няшчасце: асколкам фашысцкай бомбы быў забіты бацька. Аднак Толя не разгубіўся. Смелы па натуры, ён усяляк імкнуўся адшукаць партызан і ўліцца ў рады народных мсціўцаў.

Да свайго ўходу ў партызаны Толя падрыхтаваўся добра: у яго былі пісталет і патроны, якія яму ўдалося тайком забраць у аднаго з гітлераўцаў.

Аднойчы Толя сустрэўся са сваёй школьнай сяброўкай Оляй Дземеш, таксама піянеркай, якая к гэтаму часу ўжо мела сувязь з партызанамі. Дамовіўшыся, Оля і Толя 15 чэрвеня 1942 года сталі народнымі мсціўцамі брыгады «Чэкіст», якая дзейнічала на Аршаншчыне.

Зусім нядоўга Толя асвойваўся з партызанскім жыццём. Было цяжка, але старэйшыя таварышы акружылі яго цеплынёй і клопатамі, навучылі метадам вядзення разведкі і падрыўной справе.

Аднойчы камандзір атрада Шамарын выклікаў Толю да сябе і сказаў:

— Ёсць цікавая справа, і выкананне яе даручаецца табе.

У падранай вопратцы і з



плячыма Толя паявіўся ў варожым гарнізоне мястэчка Копысь. Вартавы жалю выгляд «жабрака» не прыцягнуў да сябе ўвагі гітлераўцаў, але затое Толя заўважаў усё: і месца стаянкі танкетак і бронемашын, і склад гаручага. Аб усім ён потым паведаміў свайму камандаванню. А неўзабаве Толя прыняў асабісты ўдзел у падрыве варожага склада гаручага. Партызаны бясшумна «знялі» вартавых, захапілі ў палон салдат, якія спалі ў каравульным памяшканні, і ўзарвалі гэты склад. Так пад носам у копыскага гарнізона і без страт была здзейснена гэта дзёрзкая аперацыя.

Удзельнічаў Толя і ў «рэйкавай вайне». З яго ўдзелам

было спушчана пад адхо шэсць варожых эшалонаў тэхнікай і жывой сілай гітле раўцаў.

У сакавіку 1944 года, вяр таючыся з чарговага задання Толя трапіў у фашысцкую за саду і ў перастрэлцы быў па ранены. Рана аказалася сур ёзнай, і яго накіравалі на ля чэнне на Вялікую зямлю. Ура чы хутка паставілі юна смельчака на ногі, і ён зно папрасіўся ў тыл ворага, той жа раён Копысі.

А ў чэрвені 1944 года пар тызаны злучыліся з часцям Чырвонай Арміі.

За мужнасць і адвагу баях супраць гітлераўскіх аку пантаў Толя Карнееў узнага роджан ордэнам Чырвона Зоркі і медалем «Партызан Вялікай Айчыннай вайны» І ступені.

Пасля вайны Толя скончы суворaўскае, а затым афіцэр скае вучылішча і праслужы у Савецкай Арміі амаль 3 год.

Поспехі афіцэра-камуніста Анатоля Пракопавіча Карне ева ў пасляваенныя гады так сама адзначаны многімі высо кімі ўрадавымі ўзнагародамі.

Цяпер маёр запасу А. П Карнееў жыве ў г. Урупінск Валгаградскай вобласці. Час та сустракаецца з піянерамі расказвае аб сваіх баявы справах у тыя далёкія, цяж кія і незабыўныя гады дзяцін ства.

**Толя Карнееў** стаў народным мсціўцам брыгады «Чэкіст», якая дзейнічала на Аршаншчыне ў 1942 годзе. Пад выглядам жабрака пракраўся ў варожы гарнізон мястэчка Копысь і перадаў усе звесткі аб месцы стаянкі танкетак і бронемашын свайму камандаванню. Удзельнічаў у «рэйкавай вайне», уваходзіў у склад групы, якая спусціла пад адхон шэсць варожых эшалонаў з тэхнікай і жывой сілай. За мужнасць і адвагу ў баях супраць гітлераўскіх акупантаў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» II ступені.

ДАВц. Ф.9742-п. Воп.6. Спр.45. Арк.80.

# Саша Печкуроў



Александр Печкуров

## Па ўказанню камбрыга

Сыну сельскіх настаўнікаў Каспляпскай школы Сашу Печкурову к пачатку Вялікай Айчыннай вайны ледзь споўнілася трынаццаць год, ён толькі што скончыў сем класаў.

З першых жа дзён фашысцкай акупацыі Саша са сваімі равеснікамі пачаў рыхтавацца да актыўнай барацьбы супраць акупантаў. Яму ўдалося ў рацэ Каспля выявіць схаваныя пры адыходзе савецкіх войск карабіны з патронамі і станкавы кулямёт. У маі 1942 года ён паказаў партызанам месца ў рацэ, дзе была зброя.

Партызаны, з якімі сустрэўся Саша, дасталі са дна 30 карабінаў, станкавы кулямёт і шмат патронаў да іх.

Гэты ўчынак Сашы быў дастойна ацэнены, і па асабістаму ўказанню партызанскага камбрыга Аляксея Данукалава ён быў залічан у атрад «Смерць ворагам».

Настойлівы і дапытлівы, Саша хутка асвоіўся ў новых складаных абставінах і ў першым жа адкрытым баі з фашысцкімі карнікамі ў чэрвені 1942 года даказаў, што яго недарэмна называюць партызанам: са свайго карабіна ён знішчыў у баі двух гітлераўскіх кулямётчыкаў.

Неаднаразова Саша паспяхова выконваў заданні партызанскага камандавання па збору патрэбнай інфармацыі аб перамяшчэннях варожых часцей, іх узбраенні і размяшчэнні ў гарнізонах.

У лістападзе 1942 года карнікі схапілі малодшую сястру Сашы і разам з многімі жыхарамі Суража і іншых населеных пунктаў па-зверску закатавалі. Вестка аб гэтай трагедыі дайшла і да Сашы, і ён перад сваімі старэйшымі таварышамі пакляўся жорстка адпомсціць ворагу за гібель савецкіх патрыётаў і сваёй сястрычкі.

Клятву сваю юны піянер стрымаў з гонарам.

Вось адзін з баявых эпізодаў. Сашу Печкурову даручылі разведаць подступы да чыгуначнага моста на перагоне Забалоцінка—Выдрэя. Група партызан з яго ўдзелам у ліпені 1943 года зрабіла дзёрзкае нападзенне на ахову моста, перабіла яе і ўзарвала мост разам з фашысцкім воінскім эшалонам з гаручым.

Нямала на рахунку Сашы і іншых баявых подзвігаў, здзейсненых ім у партызанскім атрадзе.

Жыццё Аляксандра Печкурова склалася так, што і пасля Вялікай Айчыннай вайны яму шмат яшчэ даводзілася ўдзельнічаць у жорсткіх сутычках з ворагамі нашай Радзімы. Ён быў актыўным удзельнікам ліквідацыі бандыцкіх груп на тэрыторыі заходніх раёнаў Украіны і Прыбалтыкі.

Пры абароне Айчыны быў тройчы ранены. Подзвігі адважнага юнака адзначаны высокімі ўзнагародамі. Яго грудзі ўпрыгожваюць ордэн Айчыннай вайны II ступені і шмат медалёў.

Цяпер член КПСС афіцэр запасу Аляксандр Сяргеевіч Печкуроў пражывае ў пасёлку Негарэлае Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. Шмат часу аддае выхаваўчай рабоце сярод моладзі.

З першых дзён вайны **Саша Печкуроў** са сваімі аднагодкамі пачаў рыхтавацца да актыўнай барацьбы супраць акупантаў. У маі 1942 года перадаў выяўленую ў рацэ Каспля зброю партызанам і па асабістым указанні камбрыга Аляксея Данукалава быў залічаны ў атрад «Смерць ворагам». Са свайго карабіна 13-гадовы партызан забіў у баі двух гітлераўскіх кулямётчыкаў. Паспяхова выконваў заданні па зборы інфармацыі аб перамяшчэнні варожых частак, іх узбраенні і размяшчэнні ў гарнізонах, здзяйсняў шмат іншых заданняў. Узнагароджаны ордэнам «Айчыннай вайны II ступені».

ДАВц. Ф.9742-п. Воп.6. Спр.45. Арк.81.

# Аня Кулагіна



Анна Кулагина

## РЫЗЫКОЎНАЕ РАШЭННЕ

У ліпені 1941 года гітлераўскія орды ўварваліся ў Віцебск. Фашысты прынеслі савецкім людзям беспрасветную цемру, пакуты і смерць. Але жорсткі акупацыйны рэжым не паставіў наш народ на калені. Савецкія людзі, выхаваныя ў духу беззапаветнага патрыятызму, з першых жа дзён акупацыі разгарнулі свяшчэнную вызваленчую барацьбу супраць гітлераўскіх захопнікаў.

Мовай зброі размаўлялі з ворагам не толькі героі-адзіночкі, але і невялікія падпольныя групы, якія аб'ядноўвалі камуністаў, камсамольцаў, беспартыйных патрыётаў, у тым ліку і юных ленінцаў.

Адна з такіх груп, якую ўзначальвалі В. Кулагіна і В. Азеуш, дзейнічала ў вёсцы Букаціна. Ведаючы аб падпольнай дзейнасці сваёй старэйшай сястры камсамолкі Веры, піянерка Аня дабілася, каб і ёй даручылі выкананне пасільных заданняў. Па заданню падпольшчыкаў Аня неаднаразова хадзіла ў Віцебск для высвятлення становішча ў горадзе. Нярэдка можна было бачыць яе і на дарогах, па якіх рухаліся аўтамашыны з гітлераўцамі.

Такім метадам Аня збірала каштоўныя звесткі, неабходныя як партызанскаму, так і ваеннаму камандаванню.

Дом Кулагіных у начны час часта наведвалі партызаны і іх сувязныя. Па даносу здрадніка акупацыйным уладам стала вядома аб гэтым. Карнікі некалькі разоў наладжвалі засады каля дома Кулагіных, але безвынікова.

Аднойчы (было гэта ў канцы красавіка 1942 года) Аня заўважыла, што да іх дома ідуць падпольшчыкі В. Азеуш і Г. Юпатаў. Як іх папярэдзіць аб засадзе? Небяспека, якая навісла над падпольшчыкамі, ды і над сям'ёй Кулагіных, прымусіла прыняць рызыкоўнае, але адзіна правільнае рашэнне. Выскачыўшы з дома, яна закрычала: «Засада!». Падпольшчыкі схаваліся, пазбегнуўшы немінучага арышту і расправы. А Аню і яе маці хоць гітлераўцы і затрымалі, але ў сувязі з тым, што пераканаўчых доказаў сувязей з партызанамі і падпольшчыкамі не было, адпусцілі.

У жніўні 1942 года Аня напісала і распаўсюдзіла сярод насельніцтва вёскі лістоўкі са зводкамі Савецкага інфармбюро аб становішчы на савецка-германскім фронце. І хоць акупанты спрабавалі ўстанавіць выканаўцаў і распаўсюджвальнікаў гэтых лістовак, ім гэт... зрабіць не ўдалося.

У верасні 1942 года Ан... пайшла ў партызаны. Знаходзілася пры шпіталі 1-й Беларускай партызанскай брыгады. Як магла, дапамагала медыкам даглядаць параненых і хво... рых народных мсціўцаў.

За мужнасць у барацьбе су... праць гітлераўскіх захопніка... Аня ўзнагароджана медалям... «За адвагу» і «За доблесну... працу ў Вялікай Айчынна... вайне».

Цяпер Ганна Сямёнаўна Ку... лагіна (Арэхава) жыве ў В... цебску, працуе інжынерам-тэ... нолагам на заводзе заточны... станкоў імя XXII з'езда КПС...

Ведаючы пра падпольную дзейнасць сваёй старэйшай сястры, **Аня Кулагіна** дамаглася, каб і яе прыцягнулі да выканання пасільных даручэнняў. Неаднаразова юная падпольшчыца хадзіла ў Віцебск для вывучэння абстаноўкі ў горадзе, збірала каштоўныя звесткі, неабходныя партызанскаму і ваеннаму камандаванню. Пісала і распаўсюджвала сярод насельніцтва вёскі Букаціна лістоўкі са зводкамі Савецкага інфармбюро аб становішчы на савецка-германскім фронце. З верасня 1942 года Аня пайшла ў партызаны і знаходзілася пры шпіталі 1-й Беларускай партызанскай брыгады. Дапамагала медыкам, даглядала параненых. Узнагароджана медалямі «За адвагу»,«За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне».

ДАВц. Ф.9742-п. Воп.6. Спр.45. Арк.82.

# Віця Іваноў

## Пачастунак для каменданта



Нарадзіўся Віктар Іваноў на Суражчыне ў 1928 годзе ў сялянскай сям'і. У разгар калектывізацыі кулакі спалілі хату Івановых. Гэта была іх помста беднаце, якая змагалася за новае жыццё.

Віктар да вайны скончыў чатыры класы Лемніцкай школы. Быў піянерам, з гордасцю насіў чырвоны гальштук.

Вайна. На другі дзень на фронт пайшоў бацька. Старэйшы брат Фёдар — навучэнец рамеснага вучылішча ў Ленінградзе — запісаўся ў армію добраахвотнікам.

Усведамляючы сваю прыналежнасць да лёсу Радзімы, Віктар увесь час думаў, чым бы ён мог дапамагчы сваім. Спачатку збіраў лістоўкі, чытаў іх жанчынам-салдаткам.

Неўзабаве ў вёску прыйшлі партызаны, сярод іх быў і даваенны настаўнік мясцовай школы Т. Е. Карасёў. Віктар стаў выконваць яго даручэнні, галоўным чынам, па разведцы.

Аднойчы пры раскідванні лістовак на бальшаку Сураж — Віцебск ён папаўся. Выратаваў выпадак. Давялося тэрмінова пакідаць вёску.

Захапіўшы вінтоўку з патронамі, сумку, гранаты, ён з'явіўся ў партызанскі атрад. З 16 мая 1942 года Віктар Іваноў стаў разведчыкам атрада Аляксея Гурко 1-й Беларускай партызанскай брыгады.

Летам 1942 года Віктар быў прыняты ў камсамол. Пачалося нялёгкае партызанскае жыццё, якое патрабавала вялікай вынослівасці, знаходлівасці, мужнасці і бясстрашнасці.

У вёсцы Задуброўе, што размешчана на бальшаку Сураж—Віцебск, быў моцны варожы гарнізон. Па абодва бакі ад яго пралеглі партызанскія сцежкі, па якіх народныя мсціўцы пераходзілі праз бальшак. Вядома, гарнізон цікавіў партызан.

Летам 1942 года Віктар атрымаў заданне разведаць яго.

Версія, згодна з якой хлопчыку неабходна абавязкова пабываць у гарнізоне, была вельмі простай. У кошыку на сене ляжала некалькі дзесяткаў яек, у кішэні — нямецкія маркі. Усё гэта прызначалася для пана каменданта вёскі Задуброўе, каб атрымаць для хворай маці спірт і лякарства. Пад сенам у кошыку былі лістоўкі.

Не без прыгод Віктар дабраўся да гарнізона, выканаў заданне і паспяхова вярнуўся ў атрад.

За год партызанскага жыцця Віктар удзельнічаў ва ўсіх баявых аперацыях атрада. Ён быў у засадзе на бальшаку Сураж — Віцебск, калі партызанам удалося разбіць чатыры варожыя аўтамашыны, прымаў удзел у баі ля вёскі Кароўка, у выніку якога гітлераўцы знялі свой гарнізон у суседняй вёсцы Іванькова і ўцяклі ў Саловічы. Удзельнічаў у баі ля вёскі Любшчына, які працягваўся амаль 12 гадзін.

У студзені 1943 года Віктар разам з баявымі сябрамі граміў варожы гарнізон у вёсцы Саловічы. Ішлі партызаны па глыбокім снезе, стаміліся. Але як толькі ўзвілася сігнальная ракета, якая азначала пачатак атакі, партызаны дружна адкрылі агонь, з крыкамі «За Радзіму, наперад! Ура!» уварваліся ў вёску і вымусілі гітлераўцаў і паліцэйскіх даваць драпака. Партызанам дасталіся багатыя трафеі.

У лютым — сакавіку 1943 года гітлераўцы пачалі буйную карную экспедыцыю супраць партызан Віцебска-Суражскай зоны, паступова сціскаючы кальцо акружэння. У той час Віктар выконваў ролю сувязнога. У адной з перастрэлак быў лёгка паранены, а затым абмарозіў ногі і не мог хадзіць.

У красавіку 1943 года, калі зноў наладзілася сувязь з «Вялікай зямлёй», Віктар самалётам быў перапраўлен у савецкі тыл і адразу ж трапіў у шпіталь, дзе праляжаў да чэрвеня.

Пасля папраўкі папрасіўся ў армію. Спачатку яго пакінулі працаваць у шпіталі, а затым камандаванне накіравала ў 159-ы асобны запасны стралковы полк, размешчаны на захад ад Невеля. У гэтым палку такіх, як Віктар, падлеткаў-добраахвотнікаў было 25 чалавек. У лютым 1944 года іх дэмабілізавалі, каб яны маглі працягваць спыненую вайной вучобу.

Віктар прыбыў у родныя мясціны. Вучыўся, а затым працаваў брыгадзірам, рахункаводам, быў выбран сакратаром камсамольскай арганізацыі калгаса «Савецкая Беларусь».

У 1948 годзе Віктара прызвалі ў рады Савецкай Арміі. Служыў у рэактыўнай артылерыі. Закончыў школу сержанцкага саставу, вочна-завочную сярэднюю школу, ваеннае вучылішча. Праслужыў у арміі звыш 28 год. У 1975 годзе ў званні маёра звольнен у запас. Цяпер пенсіянер. Жыве ў Гомелі.

За баявыя заслугі перад Радзімай узнагароджан ордэнам Чырвонай Зоркі і дзесяццю медалямі.

Піянер, які з гонарам насіў чырвоны гальштук, **Віця Іваноў**, з пачатку вайны распаўсюджваў лістоўкі, а з 1942 года стаў разведчыкам атрада Аляксея Гурко І-й Беларускай партызанскай брыгады. Улетку 1942 года Віця атрымаў і паспяхова выканаў заданне разведаць варожы гарнізон на бальшаку Сураж – Віцебск. Пазней удзельнічаў у разгроме варожага гарнізона у вёсцы Саловічы, у баі каля вёсак Кароўка, Любшчына, іншых аперацыях. За баявыя заслугі перад Радзімай узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і дзесяццю медалямі.

ДАВц. Ф.9742-п. Воп.6. Спр.45. Арк.83.

# Коля Падалінскі

## СЯРОД СЯБРОЎ-ЗАСЛОНАЎЦАЎ



Як толькі ў навакольных лясах пачалі ўзнікаць партызанскія атрады, многія жыхары вёскі Барок Сенненскага раёна сталі народнымі мсціўцамі. Тыя ж, што засталіся дома, чым маглі дапамагалі лясным салдатам. Нездарма партызанскую барацьбу ў тыле ворага называюць усенароднай.

У пачатку ліпеня 1943 года камісар атрада імя М. І. Кутузава 1-й партызанскай брыгады імя К. С. Заслонава М. І. Вятошкін даручыў піянеру Колю Падалінскаму сабраць звесткі аб эшалонах праціўніка, якія праходзяць праз станцыю Багушэўскую ў бок Віцебска і Оршы.

Хлопчык з радасцю згадзіўся выканаць адказнае даручэнне. Пад выглядам беспрытульнага ён хадзіў каля чыгуначных пуцей, некалькі разоў паяўляўся на станцыі. Ніхто і падумаць не мог, што гэты «бяздомны» хлапчук, якіх нямала было ў час вайны, выконвае заданне партызан-заслонаўцаў.

Тым часам Коля рабіў сваю небяспечную справу. Эшалонаў праз станцыю праходзіла нямала, і трэба было ўтрымаць у памяці, у які час і ў якім напрамку рухаюцца яны ў бок Віцебска ці Оршы.

Сабраўшы каштоўныя звесткі, хлопчык рашыў зайсці дадому, пераначаваць, а назаўтра адправіцца да месца размяшчэння партызанскага атрада.

Раніцай Колю разбудзіў устрывожаны матчын голас: «Уставай, у вёсцы немцы!».

У адно імгненне хлопчык ускочыў з ложка, хуценька апрануўся і сказаў: «Я бягу ў лес да партызан...».

Толькі на наступны дзень Коля сустрэўся з партызанскімі разведчыкамі непадалёк ад вёскі Старая Беліца. Але яны былі не з атрада імя М. І. Кутузава, якіх ён шукаў, а з атрада імя С. Г. Лазо 2-й брыгады імя К. С. Заслонава. Хлопчыку сказалі, што атрад, які ён шукае, знаходзіцца на заданні, а прынесеныя ім звесткі трэба перадаць у штаб іх атрада.

Коля застаўся ў атрадзе імя С. Г. Лазо, дзе неўзабаве сустрэўся са сваімі стрыечнымі братамі Маркам і Аляксеем — камсамольцамі з яго вёскі Барок. Абодва браты былі ў атрадзе камандзірамі ўзводаў.

Прыкладна праз месяц Коля Падалінскі сустрэўся з камісарам М. І. Вятошкіным. Ён перавёў яго ў атрад імя М. І. Кутузава, якім камандаваў М. І. Гурусаў. Атрад размяшчаўся ў раёне возера Жэрынскае Чашніцкага раёна. Партызаны будавалі і ахоўвалі пасадачную пляцоўку для самалётаў з Вялікай зямлі. Тут Колю прынялі ў камсамол, тут ён даў прысягу не шкадаваць ні сіл, ні жыцця для вялікай справы вызвалення беларускага народа ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У атрадзе Коля быў разведчыкам. Камандзір М. І. Гурусаў не раз пасылаў яго і 14-гадовага Колю Русецкага ў разведку ў Чашнікі, Альшаны і іншыя населеныя пункты, дзе размяшчаліся гітлераўскія гарнізоны. На заданні яны хадзілі без зброі, пад выглядам пастушкоў ці беспрытульных. У юных разведчыкаў у многіх вёсках былі свае надзейныя памочнікі-патрыёты, такія ж падлеткі, як і яны, якія дапамагалі збіраць звесткі аб праціўніку.

Заслонаўскія партызанскія брыгады манеўравалі па населеных пунктах Аршанскага, Сенненскага, Чашніцкага і Талачынскага раёнаў. Колю звычайна ўключалі ў разведгрупы, якія збіралі звесткі аб праціўніку, сустракаліся з сувязнымі.

У час адной з аперацый Коля ледзь не трапіў у лапы акупантаў. Было гэта так. Разведгрупа размясцілася на начлег у закінутым памяшканні каля вёскі Тур'ева. Камандзір групы паслаў хлопчыка ў вёску Янова, дзе быў варожы гарнізон, на сустрэчу з сувязным. Коля хутка знайшоў патрэбнага чалавека, які перадаў партызанам разведвальныя даныя, і адправіўся ў зваротны шлях. І калі да той будынiны, дзе размясціліся партызаны, заставалася некалькі метраў, хлопчыка нечакана акружылі на конях чацвёра ўласаўцаў.

— Хто ты і адкуль? Што тут робіш? — пачалі дапытвацца ў падлетка.

І ў гэты час хлопчык пачуў голас камандзіра групы: «Коля, кладзіся!».

Ён імгненна ўпаў на зямлю. І тут жа партызаны адкрылі агонь. Двое коннікаў былі забіты, а двое кінуліся наўцёкі. Партызаны хутка ўскочылі на коней і памчалі ў бок лесу. З вёскі за імі рынулася пагоня, але ў лес уласаўцы ехаць пабаяліся

І яшчэ адзін эпізод запомніўся юнаму разведчыку на ўсё жыццё. Было гэта зімою 1944 года. Ён, Коля Русецкі і камандзір разведкі атрада Ханкевіч адправіліся на конях на заданне. Непадалёк ад вёскі Купавасць натрапілі на засаду. У час перастрэлкі Коля Русецкі быў паранены. Юнага патрыёта схапілі чужынцы. Як пасля расказвалі мясцовыя жыхары, акупанты доўга дапытваліся ў яго, дзе размяшчаецца партызанскі атрад. Але хлопчык не сказаў ні слова і загінуў як герой.

А Мікалай Падалінскі пасля вайны скончыў школу ФЗН і завочна тэхналагічны інстытут у Мінску. Працаваў слесарам, лесатэхнікам, ляснічым, галоўным інжынерам, намеснікам дырэктара леспрамгаса.

За мужнасць, праяўленую ў барацьбе з гітлераўскімі акупантамі, узнагароджан медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй» і іншымі.

Цяпер камуніст Мікалай Сцяпанавіч Падалінскі жыве ў Гродна, працуе намеснікам старшыні абласнога савета навукова-тэхнічных таварыстваў.

---

У пачатку ліпеня 1943 года камісар атрада імя Кутузава 1-й партызанскай брыгады імя Заслонава М.І. Вятошкін даручыў піянеру **Колю Падалінскаму** сабраць звесткі пра эшалоны праціўніка, якія праходзілі праз станцыю Багушэўскую ў бок Віцебска і Оршы. Праз месяц хлопчык быў уключаны ў сам партызанскі атрад пад камандаваннем М.І. Гурусава. У атрадзе Коля служыў разведчыкам. Не раз яго накіроўвалі ў разведку ў Чашнікі, Альшаны, населеныя пункты Аршанскага, Сенненскага, Чашніцкага і Талачынскага раёнаў, дзе размяшчаліся гітлераўскія гарнізоны. Збіраў інфармацыю пра суперніка, сустракаўся з сувязнымі. За мужнасць, праяўленую ў барацьбе з акупантамі, узнагароджаны медалямі «За адвагу»,«За перамогу над Германіяй».

ДАВц. Ф.9742-п. Воп.6. Спр.45. Арк.87.

# Ваня Елісеенка

Иван Елисеенко

## Выбухі на станцыі

Чыгуначная станцыя Обаль мела важнае значэнне ў перавозцы стратэгічных грузаў гітлераўскай арміі на працягу ўсяго перыяду фашысцкай акупацыі Віцебшчыны. Перад камандаваннем партызанскага спецатрада «Трэці», які дзейнічаў на тэрыторыі Шумілінскага раёна, была пастаўлена задача пастаянна перашкаджаць перавозкам акупантаў праз Обаль. З гэтай мэтай партызаны ўстанавілі сувязь з савецкім патрыётам Сяргеем Аляксеевічам Елісеенкам, які працаваў на станцыі стрэлачнікам. Для падрыву эшалонаў з ваеннымі грузамі і жывой сілай партызаны забяспечвалі яго мінамі спецыяльнага прызначэння. Неўзабаве аб сувязі С. А. Елісеенкі з партызанамі стала вядома яго трынаццацігадоваму сыну піянеру Ваню.

Пасля настойлівай просьбы Вані бацька прыняў рашэнне ўключыць і яго ў дыверсійную работу.

Бацька разумеў, што паяўленне падлетка на станцыі сярод скаплення вагонаў не выкліча асобых падазрэнняў у гітлераўцаў. Ваня, выкарыстаўшы ўдалы момант, у ліпені 1942 года падклаў міну з гадзіннікавым механізмам пад



бочкі з гаручым, загружаныя ў паўвагон, які стаяў на станцыі, а сам незаўважана знік. У той час, калі міна павінна была ўзарвацца, на станцыю прыбыў састаў з ваеннай тэхнікай, боепрыпасамі і гітлераўцамі. Роўна праз шэсць гадзін выбух страсянуў паветра. Полымя хутка ахапіла ўсё навокал. У вагонах пачалі ўзрывацца бомбы і снарады, знішчаючы жывую сілу і ваенную тэхніку ворага. Выбухі і агонь прычынілі значныя разбурэнні станцыі. Былі паралізаваны сігналізацыя і сувязь.

Для аднаўлення руху паяздоў праз Обаль фашысцкаму камандаванню спатрэбілася каля двух сутак.

У жніўні 1943 года, ужо маючы вопыт закладкі мін пад варожыя паязды, Ваня зноў паставіў на станцыі Обаль пад паўвагон з бензінам міну з гадзіннікавым механізмам. У патрэбны час міна спрацавала безадказна, у выніку чаго станцыя і станцыйная гаспадарка зноў былі надоўга выведзены са строю.

Характар і мужнасць юнага героя загартоўваліся ў гарачых сутычках з гітлераўскімі захопнікамі. Ён удзельнічаў у многіх дыверсіях на аб'ектах ворага, якія заўсёды праходзілі паспяхова.

Баявую дзейнасць бацькі і сына Елісеенкаў высока ацаніла наша Радзіма. Сяргей Аляксеевіч узнагароджан ордэнам Чырвонага Сцяга, а адважны піянер Ваня — ордэнам Айчыннай вайны I ступені і медалем «Партызану Айчыннай вайны» II ступені.

Цяпер член КПСС Іван Сяргеевіч Елісеенка жыве ў Наваполацку, працуе выкладчыкам у політэхнічным інстытуце.

**Ваня Елісеенка** папрасіў свайго бацьку, які працаваў стрэлачнікам на чыгуначнай станцыі Обаль і трымаў сувязь з партызанамі, уключыць і яго ў дыверсійную працу. З'яўленне на станцыі сярод навалы вагонаў падлетка не выклікала ў немцаў падазрэнняў, і адваважны хлопчык падклаў міну шасцігадзіннага дзеяння пад бочкі з гаручым, загружаныя ў паўвагон. Выбух знішчыў вагоны, ваенную тэхніку ворага, паралізаваўшы сігналізацыю і сувязь. Падобную дыверсію Ваня здзейсніў у жніўні 1943 г. Адважны піянер быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені і медалём «Партызану Айчыннай вайны» II ступені.

ДАВц. Ф.9742-п. Воп.6. Спр.45. Арк.89.

# Коля Пчолкин

Николай Пчелкин

## Поплеч з бацькам-разведчыкам

Скромная і непрыкметная сям'я Пчолкіных да вайны жыла і працавала ў калгасе імя Сталіна, што на Суражчыне (цяпер калгас «Чырвоны сцяг»). Калі б хто-небудзь сказаў да вайны, што Спірыд Пчолкін першым сярод калгаснікаў атрымае баявую ўзнагароду, а яго малодшы сын Мікалай стане адважным разведчыкам партызан, многія б у гэта не паверылі: звычайныя людзі, нічога ваяўнічага ў іх не было.



І вось грымнула вайна. Радзіма апынулася ў небяспецы, і Спірыд Трафімавіч пачаў выконваць самыя адказныя заданні спачатку падпольнай групы Ф. М. Іванова, створанай у вёсках Уласава і Стукальна, а затым партызанскага атрада «Крэпасць» брыгады Аляксея.

Для таго, каб лягчэй было прабірацца да варожых гарнізонаў і пранікаць туды, бацька прыцягнуў да разведвальнай работы малодшага сына, піянера Мікалая, які скончыў да вайны 4 класы Рабаўскай школы. Іншы раз яны бралі косы, садзіліся на падводу і ехалі «касіць» бліжэй да варожых гарнізонаў, а то бралі аброць і ішлі «шукаць» прапаўшых коней дзе-небудзь каля ўмацаваных кропак гітлераўцаў або па беразе ракі Каспля, якая служыла мяжой паміж партызанскімі вёскамі і гарнізонамі гітлераўцаў.

Варожыя гарнізоны ў Суражы, Шапурове, Будзянцы і іншых месцах вельмі цікавілі партызанскае камандаванне і таму разведка іх даручалася Пчолкіным. Па іх звестках быў разгромлен не адзін гарнізон акупантаў, у тым ліку ў Шапурове і Будзянцы.

Калі ж партызанская брыгада Аляксея перадыслакавалася з Касплянскай дачы ў Лёзненскі раён, а затым у Шчалбоўскія лясы, бацька з сынам пайшлі ў партызанскі атрад «Крэпасць» і працягвалі весці разведвальную работу да сакавіка 1943 года, праяўляючы пры гэтым смеласць і вынаходлівасць.

У сакавіку 1943 года, разведваючы дарогу для пераходу партызан, бацька з сынам былі схоплены карнікамі. На вачах трынаццацігадовага Мікалая быў расстраляны бацька. У гэты трагічны час Мікалай не разгубіўся і змог вышмыгнуць з рук фашыстаў і прынесці ў атрад важныя звесткі.

Пасля вызвалення родных мясц Мікалай Пчолкін разам з маці і старэйшым братам, якія засталіся ў жывых, выконваў розныя работы ў калгасе. У 1952 годзе, пасля службы ў Савецкай Арміі, скончыў курсы механізатараў і стаў працаваць трактарыстам у калгасе «Чырвоны сцяг» Віцебскага раёна.

За добрасумленную працу камуніст М. С. Пчолкін узнагароджан медалямі, граматамі і ганаровымі знакамі. У Балашоўскай школе, дзе ён вучыўся пасля вайны, у альбоме чырвоных следапытаў сабран матэрыял аб баявых справах Колі Пчолкіна.

**Коля Пчолкин,** які скончыў да вайны 4 класы школы, быў прыцягнуты да агентурнай працы сваім бацькам, Спірыдам Трафімавічам, які з пачатку вайны актыўна супрацоўнічаў з партызанамі і выконваў самыя адказныя заданні. Бацька з сынам разведвалі варожыя гарнізоны ў Суражы, Шапурове, Будзянцы і іншых месцах, якія цікавілі партызанскае камандаванне. Пасля расстрэлу карнікамі бацькі працягнуў яго справу.

ДАВц. Ф.9742-п. Воп.6. Спр.45. Арк.90.

# Модик Свірыдзенка



Модест Свириденко

## Ветэран 39-й арміі

Жыццё не песціла Модзіка Свірыдзенку. Бацька памёр, калі хлопчыку было 6 год. Застаўся з маці. У 1941 годзе скончыў 5 класаў, стаў піянерам. І раптам страшная вестка: пачалася вайна. Віцебск акупіравалі гітлераўскія фашысты. Пакутам і гору не было канца. Расправы, здзекі, шыбеніцы бачыў Модзік. Сэрца поўнілася нянавісцю да лютых ворагаў, ён прагнуў помсты. Так аднойчы і сказаў сваёй маці:.

— Пайду біць фашыстаў!

...1943 год. На ўсіх франтах ішлі цяжкія, кровапралітныя бai. Гітлераўцы пачалі выганяць з Віцебска цывільнае насельніцтва і адпраўляць у Германію. У гэты час Модзік Свірыдзенка з маці падаліся да сваіх родзічаў у вёску Загоціна Руднянскага раёна Смаленскай вобласці.

У жніўні 1943 года вёска Загоціна была вызвалена войскамі 39-й арміі. Модзік пайшоў да зампаліта і папрасіўся, каб узялі на фронт. Просьбу хлапчука задаволілі. Так 14-гадовы Модзік Свірыдзенка стаў сынам палка, апрануўся ў шынель, атрымаў зброю, сумку паштальёна і пайшоў па цяжкіх дарогах вайны.

Даручэнне было не з лёгкіх, калі ўлічыць узрост хлопчыка і складаную абстаноўку. Часам пад ураганным агнём прыходзілася паўзці з цяжкай сумкай, а адрасатаў ужо не было ў жывых.

У чэрвені 1944 года дывізія, у якой служыў Модзік Свірыдзенка, вызваляла Віцебск. У жорсткіх баях хлопчык быў кантужаны. Але паправіўся і разам са сваёй часцю пайшоў на вызваленне Прыбалтыкі.

У Кенігсбергу камандзір палка Бадрэеў аднойчы выклікаў хлопчыка да сябе і сказаў, што хутка скончыцца вайна, трэба падумаць аб будучым. І накіраваў яго ў армейскую аўташколу. Хлопчык стаў армейскім шафёрам.

Радасна адсвяткавалі Дзень Перамогі над фашысцкай Германіяй. Але яшчэ быў каварны вораг на Далёкім Усходзе — ...ракінута вайсковая часць, у якой служыў Свірыдзенка. Тут ён атрымаў машыну і прымаў актыўны ўдзел у баях.

З горада Мукдэна ў напрамку Порт-Артура накіравалася аўтакалона з боепрыпасамі. Замыкаючым калоны быў Свірыдзенка. У шляху машына сапсавалася. А калона пайшла наперад. Прыйшлося аднаму застацца ноччу ў полі. А непадалёку японцы выходзілі з акружэння, чулася страляніна.

Праз некалькі гадзін сталі набліжацца японцы. Адзін з іх кінуў паблізу гранату. Модзік не разгубіўся, выскачыў з кабіны, залёг з вінтоўкай пад машынай і пачаў страляць.

Васьмю медалямі СССР адзначаны заслугі Мадэста Свірыдзенкі перад Радзімай. У знак сумеснай барацьбы манголаў і савецкіх воінаў супраць японскіх самураяў узнагароджан медалем Мангольскай Народнай Рэспублікі.

Свой баявы шлях Мадэст Свірыдзенка закончыў у Порт-Артуры, адкуль і быў дэмабілізаваны як непаўналетні. Вярнуўся ў Віцебск, пачаў працаваць і вучыцца. Уступіў у рады КПСС. Быў электраманцёрам. Потым скончыў школу майстроў і стаў працаваць памочнікам майстра на камбінаце шаўковых тканін. Цяпер камуніст Мадэст Іванавіч Свірыдзенка старшы памочнік майстра, выдатны спецыяліст,

14-гадовы **Модзік Свірыдзенка** стаў сынам палка ў 1943 годзе. Хлопчык атрымаў шынель, сумку паштальёна і пачаў разносіць лісты ў акопы. Пасля вызвалення Віцебска Модзік адправіўся са сваёй часткай на вызваленне Прыбалтыкі. Потым вайсковая частка, у якой служыў Свірыдзенка, была перакінутая ў Маньчжурыю. Баявы шлях Мадэст скончыў у Порт-Артуры, пасля чаго вярнуўся ў Віцебск, пачаў працаваць і вучыцца. Заслугі хлопчыка перад Радзімай былі адзначаны васьмю медалямі. У знак сумеснай барацьбы манголаў і савецкіх воінаў супраць самураяў юнак быў узнагароджаны медалём Мангольскай Народнай Рэспублікі.

ДАВц. Ф.9742-п. Воп.6. Спр.45. Арк.90.

# Федзя Машчоў



# У ІМЯ РАДЗІМЫ

Федзя быў адзіным сынам у сям'і сельскага камуніста Міхаіла Машчова. Ён нарадзіўся ў студзені 1930 года, да вайны скончыў пяць класаў Ушацкай сярэдняй школы.

У жніўні 1942 года Федзя разам з бацькам і маці прыйшоў у партызанскую брыгаду «Дубава» (камбрыг Ф. Ф. Дуброўскі), з якой да гэтага яны падтрымлівалі сувязь, перадавалі народным мсціўцам зброю і прадукты.

Партызанскі лёс Федзі вызначыў бацька, заявіўшы, што сын хоча быць разведчыкам. З ім згадзіліся і пакінулі хлопца ў брыгаднай разведцы.

Федзя валодаў многімі якасцямі, якія дапамаглі яму стаць добрым разведчыкам. Ён быў фізічна моцны, сабраны, смелы і кемлівы.

У яго баявой характарыстыцы, якая захоўваецца ва Ушацкім музеі народнай славы, гаворыцца, што «...ўсе заданні камандавання ён выконваў добра. Прымаў актыўны ўдзел ва ўсіх баявых аперацыях, дзе праявіў сябе смелым і рашучым».

...У студзені 1943 года рыхтавалася наступленне партызан на гарнізон гітлераўцаў у райцэнтры Чашнікі. Было рашана наступаць з трох бакоў: уварвацца ў пасёлак павінен быў трэці атрад, на левым флангу знаходзіўся першы атрад, а на правым — другі.

Група разведчыкаў на чале з намеснікам камандзіра брыгады па разведцы Сяргеем Маркевічам, у якой знаходзіўся і Федзя Машчоў, накіравалася на процілеглы бок Чашнік, каб з тылу нечакана абстраляць гарнізон, нарабіць больш шуму (гітлераўцы падумаюць, што наступленне вядзецца вялікімі сіламі). Разведчыкі дзейнічалі рашуча і смела на працягу ўсяго бою, а ён працягваўся да раніцы.

Аднак выбіць гітлераўцаў з Чашнік не ўдалося. Тады партызаны рашылі блакіраваць варожы гарнізон, асядлаўшы ўсе дарогі, што вядуць да яго.

З 20 па 26 студзеня 1943 года днём і ноччу ішлі баі вакол Чашнік.

Партызаны абстрэльвалі гарнізон з гармат, наладжвалі засады, выматвалі праціўніка фізічна і маральна. Яны пайшлі на свае асноўныя базы толькі тады, калі гітлераўцы падцягнулі сюды буйныя сілы з танкамі і артылерыяй.

Увесь гэты час разведчыкам адпачываць амаль не даводзілася. Яны палявалі на «языкоў», здабывалі дакументы, захоплівалі пошту ворага, хадзілі на сувязь з падпольшчыкамі, каб ведаць планы і намеры гітлераўцаў, мець уяўленне аб стратах акупантаў і г. д.

Федзя Машчоў прымаў самы актыўны ўдзел ва ўсіх вылазках, засадах, хадзіў у разведку. Паводле слоў С. В. Маркевіча, Федзю бралі нават на такія аперацыі, дзе «толькі рызыка, разважнасць і смеласць рашалі поспех».

Задумалі партызаны правесці дзёрзкую аперацыю на дарозе Віцебск—Лепель. Выбралі ўчастак Бачэйкава—Камень. Засаду зрабілі ў кювеце шасэ, паставіўшы справа і злева ахову. У кювеце іх было трое: С. В. Маркевіч, Федзя Машчоў і камісар брыгаднай разведкі Васіль Вітко.

Калі фашысцкія машыны падышлі ўшчыльную да месца засады, разведчыкі трапнымі аўтаматнымі чэргамі пакасілі ўсіх гітлераўцаў. Акупанты не паспелі нават выхапіць зброю. Тры спраўныя машыны смельчакі прыгналі ва партызанскую базу.

У гэтым баі Федзю не пашанцавала. Ён быў цяжка паранены.

Юнаму разведчыку Федзю Машчову мастак-партызан Мікалай Абрыньба прысвяціў сваю карціну «Першы подзвіг». Імя Федзі неаднаразова ўпамінаецца на старонках кнігі Ф. Шлыка і П. Шопы «У імя Радзімы», дакументы аб ім беражліва захоўваюцца ва Ушацкім музеі народнай славы.

Пасля вайны да 1949 года Федзя вучыўся ва Ушацкай школе, у 1954 годзе скончыў Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін. Працаваў інструктарам аддзела прапаганды Магілёўскага абкома камсамола, выкладчыкам Магілёўскага будаўнічага тэхнікума, настаўнікам Ушацкай сярэдняй школы.

Ф. М. Машчоў узнагароджан ордэнам Айчыннай вайны II ступені, многімі медалямі. У 1977 годзе ён памёр.

**Федзя Машчоў** прыйшоў разам з бацькамі ў партызанскую брыгаду «Дубава» ў 1942 годзе. Хлопчыка пакінулі ў брыгаднай разведцы. У студзені 1943 года Федзя ў складзе групы разведчыкаў пад камандаваннем намесніка камандзіра брыгады Сяргея Маркевіча з тылу зайшлі ў Чашнікі, блакавалі варожы гарнізон, адрэзаўшы ўсе дарогі, якія вялі да яго, і амаль тыдзень вялі баі вакол Чашнікаў. Федзя ўдзельнічаў у засадах, вылазках, хадзіў у разведку. Падчас бою на дарозе Віцебск-Лепель (участак Бачэйкава – Камень) атрымаў цяжкае раненне. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

ДАВц. Ф.9742-п. Воп.6. Спр.45. Арк.93.

Дзякуй за ўвагу!